Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

CALL FOR PAPERS

**Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, Вільнюс**

**Украінскі каталіцкі ўніверсітэт, Львоў**

**Карлаў універсітэт, Прага**

Запрашаюць усіх зацікаўленых да ўдзелу ў міжнароднай канферэнцыі

# Дэкаланізацыя адукацыі і навукі ў Беларусі і Украіне: тэарэтычныя выклікі і практычныя задачы

28-30 верасня, 2023, Вільнюс

Поўнамаштабная вайна, распачатая Расіяй супраць Украіны ў 2022 годзе і падтрыманая рэжымам Лукашэнкі, па-першае, назаўсёды пахавала, спісала ў архіў, калісьці цалкам кансэнсусны тэрмін «постсавецкі рэгіён» («постсавецкія краіны»), па-другое, завастрыла ўвагу на актуальнасці дэкаланізацыі як працэсу пераадолення структурнага палітычнага і культурнага падпарадкавання «імперыі».

Першая спроба асэнсавання нашых грамадстваў з пункту гледжання каланіяльнага досведу распачалася хутка пасля распаду СССР і адштурхоўвалася ад заходняй (перш за ўсё, амерыканскай) посткаланіяльнай тэорыі (Э. Саід, Г. Співак, Х. Бхабха). Сапраўды, пасля ўтварэння незалежных дзяржаў на месцы былых савецкіх рэспублік у некаторых з іх пачалі развівацца посткаланіяльныя даследаванні, што спрыяла адрыву новай нацыянальнай самасвядомасці ад культурнага і палітычнага ўплыву савецкага (расійскага) імперыялізму. Ва Украіне посткаланіяльны дыскурс перажыў значна большы распаўсюд, чым у Беларусі, што было абумоўлена культурна-гістарычнай і сацыяльна-палітычнай спецыфікай кожнай краіны. Анексія Крыму і расійскае ўварванне ва Украіну ў 2014 годзе сталася новым доказам неабходнасці крытычнага асэнсавання імперскіх прэтэнзіяў Расеі ва Усходняй Еўропе. Прыклад сучаснай Беларусі яшчэ раз паказвае, што культурная каланізацыя ажыццяўляецца ў першую чаргу праз адукацыю і абапіраецца на пэўнае ідэалагічнае скажэнне гісторыі і іншых гуманітарных і сацыяльных навук. Канферэнцыя накіравана на тое, каб распрацаваць тэарэтычны і метадалагічны падмурак для ажыццяўлення працы дэкаланізацыі ў сённяшніх умовах і пасля сканчэння вайны. Як слушна адзначаюць В. Міньёла і М. Тластанава (2012), каланізацыя ўзнаўляецца праз паўсядзённыя звычкі мыслення, а супраціўленне ёй магчыма праз развіццё

мэтанакіраваных практык «навучання адвучванню». Такім чынам, адукацыйная і медыйная сферы становяцца галоўным полем дэкаланізацыі, а акадэмія здольная даваць змястоўны кантэнт, альтэрнатыву «каланіяльнай матрыцы ўлады», фармаваць навуковыя супольнасці і структуры, артаганальныя існым культурным іерархіям.

Перш за ўсё канферэнцыя павінна засяродзіцца на вызначэнні сэнсу і рэлевантнасці паняцця дэкаланізацыі ў сучасных умовах у дачыненні да сістэмы адукацыі і навуковых даследаванняў у Беларусі і Украіне. Натуральна, для таго, каб сёння прасоўваць устаноўку на дэкаланізацыю ў галіне прадукавання сацыяльна-гуманітарных ведаў, неабходна спачатку абгрунтаваць дапушчальнасць характарыстыкі савецкай – а часткова, магчыма, і пост-савецкай – эпохі ў нашых двух краінах як эпохі каланізацыі. Добра вядома, што на гэты рахунак у міжнароднай навуковай супольнасці існуюць розныя меркаванні. Канферэнцыя мае стаць месцам для адпаведных міждысцыплінарных дыскусій і тэарэтычнага высвятлення ўмоваў і спецыфічнага сэнсу ўжывання канцэпту дэкаланізацыі ў адносінах да грамадстваў Беларусі і Украіны.

Дадатковыя тэарэтычныя выклікі звязаны з тым, што распрацоўка тэмы дэкаланізацыі (прадукавання) ведаў у нашых краінах павінна ўлічваць таксама адносна новы дыскурс дэкаланіяльнасці (decoloniality), які вельмі плённа развіваецца ў першую чаргу навукоўцамі з нееўрапейскіх краін у рэчышчы абвешчанага «дэкаланіяльнага павароту». Як суадносяцца дэкаланізацыя і дэкаланіяльнасць у нашым кантэксце? Якія аспекты паняцця дэкаланіяльнасці адпавядаюць нашай сітуацыі і нашым практычным задачам? Ці ёсць магчымасць сумяшчаць накіраванасць дэкаланізацыі супраць падпарадкавання «расійскай імперыі» з накіраванасцю дэкаланіяльнасці супраць заходнееўрапейскай (мадэрнай) парадыгмы прадукавання ведаў?

Практычнае вымярэнне канферэнцыі звязана з неабходнасцю адказу на пытанне: як менавіта павінна ажыццяўляцца дэкаланізацыя ў адукацыі і сацыяльна-гуманітарных даследаваннях? У гэтым плане ўкраінскае грамадства мае ўжо багаты досвед, звязаны і з рэформамі сістэмы адукацыі, і з прасоўваннем украінскіх даследаванняў у глабальнай акадэміі. Беларуская грамадзянская супольнасць, якая ў 2020 годзе засведчыла сваю суб’ектнасць і свае дэмакратычныя прынцыпы, прыйшла да асэнсавання неабходнасці дэкаланізацыі як палітычнага прыярытэту, які павінен стаць асновай будучай рэформы сістэмы адукацыі ў Беларусі. Пры гэтым дэкаланізацыя ёсць практычнай задачай, якая аб’ядноўвае беларусаў і ўкраінцаў у нашых імкненнях да нацыянальнай незалежнасці і якая патрабуе супольнага пераасэнсавання канфігурацыі рэгіянальнага супрацоўніцтва. Нас аб’ядноўвае таксама своеасаблівая «падвойная каланіяльная пятля», адпаведна якой расійскія імперскія амбіцыі на так званай «постсавецкай прасторы» доўгі час узмацняліся (а часткова і дагэтуль узмацняюцца) дамінаваннем Расіі як тэматычнага фокуса ў навуковай дзейнасці заходніх цэнтраў постсавецкіх, славянскіх і/ці ўсходнееўрапейскіх даследаванняў.

Такім чынам, задача дэкаланізацыі, актуальнасць якой першапачаткова вызначаецца ў нашых нацыянальных кантэкстах, павінна асэнсоўвацца ў сувязі з глабальнай палітыкай ведаў і з пункту гледжання нашага ўдзелу ў гэтай палітыцы. Адпаведна, пытанне дэкаланізацыі павінна разглядацца і з унутранай, і з вонкавай перспектывы, то бок і вачыма саміх беларусаў і ўкраінцаў, і вачыма замежных даследчыкаў нашых краін. У сувязі з гэтым асобнай практычнай мэтай канферэнцыі з’яўляецца абмеркаванне супольнай палітыкі дэкаланізацыі і стварэнне нетворка для далейшага прасоўвання дэкаланізацыі ў беларускіх і ўкраінскіх даследаваннях у нацыянальных, рэгіянальных і глабальных кантэкстах.

---

<u>На канферэнцыі прапануецца абмеркаваць наступныя пытанні</u>:

- вынікі і ўрокі пасткаланіяльных даследаванняў у Беларусі і Украіне;

- украінскі даваенны досвед дэкаланізацыі ў адукацыі і навуцы;

- дэкамунізацыі, дэсаветызацыі, дэкаланізацыя;

- досвед субалтэрна як новага «зборачнага пункта» над старымі рэгіянальнымі падзеламі – ад Цэнтральнай Азіі да Цэнтральнай Еўропы;

- канец «пастсавецкасці» і рэцэнтралізацыя ўсходнееўрапейскіх даследаванняў;

- дэкаланізацыя, нацыятворчасць, еўрапеізацыя – скрыжаванні і парадоксы;

- дэкаланізацыя ў школьнай адукацыі: стварэнне нацыянальнага канону і касмапалітычная перспектыва;

- універсітэт як пляцоўка і рухавік дэкаланізацыі;

- задачы дэкаланізацыі і рэгіянальнае супрацоўніцтва;

- феномен самакаланізацыі ў навуковых даследаваннях: усходняя і заходняя версіі;

- пераадоленне парадыгмы «пастсавецкасці» і перспектывы беларускіх і ўкраінскіх даследаванняў у глабальным кантэксце.

---

Канферэнцыя прадугледжвае наступныя фарматы:
дыскусіі, тэматычныя панэлі, працу ў групах.

Прымаюцца заяўкі на:

- арганізацыю тэматычных панэляў,
- арганізацыю дыскусій,
- індывідуальныя даклады.

Працоўныя мовы: англійская, беларуская, украінская.

Для таго каб прыняць удзел у канферэнцыі ў якасці выступоўцы, арганізатара панелі ці дыскусіі неабходна запоўніць АНЛАЙН-ФОРМУ.

*Тэрмін падачы заявак: да 15 ліпеня 2023.*

Пры неабходнасці ўдзельнікі канферэнцыі могуць атрымаць падтрымку (travel grant памерам 400€) для ўдзелу у канферэнцыі.

На падставе канферэнцыі плануецца падрыхтаваць спецыяльны нумар часопісу *Topos*.

**Усе пытанні звязанныя з канферэнцыяй можна дасылаць на электронны адрас:** decolonization-conference@ehu.lt